Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №112 (28476)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Страціў зрок, але не апусціў рукі**



**Я навучу сына біцца…**



**Гісторыі ў лістах-успамінах**

СТАР. 15

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«У нас шмат зроблена ў сферы аховы здароўя, але яшчэ далёка не ўсё. Дзесьці не хапае прафесіяналізму, дзесьці адстаём тэхналагічна. Аб'ектыўных прычын шмат. І задача ўлады, аб'яднаўшы намаганні з прафесіяналамі сваёй справы, спецыялістамі-медыкамі, — як мага хутчэй ліквідаваць недахопы, узняць якасць медыцынскай дапамогі да таго ўзроўню, які хочуць бачыць нашы людзі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.06.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,8771 ▲ |
| Еўра | 2,1048 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0721 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ДАРОЖКУ…



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Выпускнікі 16-й школы горада Полацка каля Барысавага каменя, які знаходзіцца на высокім беразе Дзвіны побач з Сафійскім саборам. Здавён лічылася, што рэліктавы валун валодае незвычайнай энергетыкай, якая спрыяе чалавеку ў яго духоўным жыцці, напаўняе цела здароўем. Перад паступленнем у навучальныя ўстановы полацкія выпускнікі заўсёды прыходзяць да запаветнага каменя, каб іх мары і надзеі спраўдзіліся.**

■ Шлях па Беларусі

## КАРМІЦЬ — СМАЧНА, ЗАПРАЎЛЯЦЬ — ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЮ

### Рэальнасць і будучыня прыдарожнага сэрвісу

**Сёння адкрыць кафэ непадалёк ад трасы можа практычна кожны, а пляцоўку для гэтага можна выбраць у інтэрнэце. Аднак намеснік начальніка ўпраўлення бытавога абслугоўвання і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Ларыса КАМАРОВА папярэджвае: адкрываць падобны аб'ект — рызыкоўна. Тэма сучаснага стану і перспектыў развіцця прыдарожнага сэрвісу была абмеркавана на прэс-канферэнцыі ў Мінску.**

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ У свеце

## Жахлівая ноч

### У Лондане згарэў 24-павярховы жылы дом

**Надзвычайнае здарэнне адбылося ў Вялікабрытаніі. Як мінімум шэсць чалавек загінулі, дзясяткі пацярпелі ў выніку моцнага пажару, які шмат гадзін бушаваў у шматпавярховым жылым доме на захадзе Лондана. У момант узнікнення агню ў 24-павярховым будынку Грэнфел-таўэр магло знаходзіцца да 600 чалавек.**



newsru.com

Як паведамляе сайт Рускай службы ВВС, у Лонданскую пажарную брыгаду ў 00.54 ночы ў сераду паступіў званок з паведамленнем аб агні ў жылым доме Грэнфел-таўэр на вуліцы Лацімер-Роўд у раёне Паўночны Кенсінгтан. На месцы тушэння пажару працавалі 40 пажарных разлікаў і больш за 200 пажарных. Больш за 20 карэт «хуткай дапамогі» прыбылі да будынка, які быў ахоплены агнём з другога па апошні паверхі.

Што да прычыны пажару, то яна пакуль не вызначана. Ёсць версія, што ўсё адбылося з-за халадзільніка, які ўзарваўся. Спецыялісты называюць здарэнне беспрэцэдэнтным. Многія пажарныя, якія аддалі прафесіі ўсё жыццё, не сутыкаліся з падобным ніколі.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!